ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 9 (1007) ● ЧАЦВЕР, 22 сакавіка 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII





Кожная хвіліна працоўнага дня — напружанай вучобе.

Лабараторныя заняткі па фізічнай хіміі ў студэнтаў III курса хімічнага факультэта.

Фота **Д. Чаховіча.**



## ПА УНІВЕРСІТЭТУ

Ужо некалькі дзён гасцяць ва універсітэце дэлегацыя Львоўскага ордэна Леніна універсітэта імя Івана Франка. У саставе дэлегацыі камсамольскія і прафсаюзныя актывісты, удзельнікі мастацкай самадзейнасці. Госці прынялі ўдзел у сяброўскіх гутарках, якія былі наладжаны ў парткоме і камітэце камсамола, агледзелі універсітэт, пабывалі ў Хатыні і на Кургане Славы, у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

20 сакавіка ў актавай зале быў дадзен вялікі канцэрт: выступаў ансамбль песні і танца Львоўскага універсітэта «Чарамош».

●

Адбылося пасяджэнне арганізацыйнай камісіі па падрыхтоўцы і правядзенню ў красавіку навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 10-годдзю стварэння студэнцкіх будаўнічых атрадаў БДУ. На канферэнцыю запрошаны дэлегацыі вну Мінска, універсітэтаў Калінінграда і Кіева, абласнога і рэспубліканскага штабаў працоўных спраў і іншыя. Канферэнцыя пройдзе ў дні святкавання 103-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна.

На пасяджэнні была абмеркавана таксама тэматыка дакладаў і парадак правядзення канферэнцыі.

●

Падведзены вынікі спаборніцтваў па ваеннаму трохбор'ю на прыз Героя Савецкага Саюза У. С. Амельянюка. Першае месца ў камандным першынстве заняў факультэт журналістыкі, другое — фізфак, трэцяе — хімфак.

У асабістым заліку пераможцамі сталі Янцалевіч (хімфак), Ханцэвіч (журфак) і Хмяльніцкі (фізфак).

# ВУЧОБЕ—НАВУКОВУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ

На вучоным савеце універсітэта былі падведзены вынікі першага семестра 1972-73 навучальнага года і акрэслены новыя задачы ў вучэбна-выхаваўчай і метадычнай рабоце. Як вядома, важнейшым паказчыкам з'яўляецца паспяховасць студэнтаў. У цэлым па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі яна складае 92,11 працэнта (за гэты ж перыяд мінулага года — 91,3 працэнта). На выдатна здалі экзамены 13,98 працэнта студэнтаў; на выдатна і добра—46,47; атрымалі змешаныя адзнакі—28,19; здавальняючыя — 3,47 і нездавальняючыя — 7,89 працэнта.

Высокую паспяховасць паказалі студэнты па грамадскіх дысцыплінах: гісторыі КПСС (98,2), марксісцка-ленінскай філасофіі (99,2), палітэканоміі (98,5), навуковаму камунізму (97), навуковаму атэізму (100). Гэта сведчыць не толькі аб вялікай зацікаўленасці студэнтаў да марксісцка-ленінскай тэорыі, але і аб значнай рабоце выкладчыкаў.

Сярод факультэтаў лепшых поспехаў дабіліся:
гістарычны (96,76)
журналістыкі (96,71)
юрыдычны (95,67)
геаграфічны (93).
біялагічны (92,84)
філалагічны (92,22)
хімічны (92,12).

Ніжэй сярэдняй па універсітэту паспяховасць у студэнтаў:
факультэта прыкладной матэматыкі (91,37)
фізічнага (89,8)
спецыяльнага факультэта прыкладной матэматыкі (89)
матэматычнага (88).

Значна ніжэй паспяховасць студэнтаў на вячэрніх аддзяленнях, дзе яна складае 79,4 працэнта. Такім жа паказчыкам характарызуецца гэты перыяд і мінулага года. Ніжэй сярэдняй паспяховасць вячэрнікаў на геаграфічным, юрыдычным, біялагічным і матэматычным факультэтах.

На вучоным савеце была адзначана параўнаўча нізкая паспяховасць на малодшых курсах. Гэта сведчыць аб яшчэ недастатковай вучэбна-метадычнай рабоце дэканатаў і кафедр, іх аслабленым кантролі за самастойнай работай студэнтаў. Неабходна весці сістэматычны ўлік бягучай паспяховасці, больш удзяляць увагі правядзенню калоквіумаў, субяседаванняў, семінараў і кантрольных работ па найбольш важных раздзелах курсаў.

Важнейшым фактарам павышэння паспяховасці з'яўляецца добра арганізаваная самастойная работа студэнтаў. Аб'ём гэтай работы, канкрэтны змест і колькасць неабходных гадзін па кожнай дысцыпліне павінны вызначацца кафедрамі і метадычнымі камісіямі курсаў. Арганізоўваць і планаваць самастойную работу трэба гэтак жа абгрунтавана, як і абавязковыя вучэбныя заняткі. Планаванне самастойнай работы неабходна лічыць важнейшай навукова-метадычнай работай кафедр.

1-га сакавіка закончыўся першы семестр на падрыхтоўчым факультэце. Закончылі яго выдатна 2 працэнты слухачоў, выдатна і добра — 25, маюць адну-дзве здавальняючыя адзнакі 56 працэнтаў і толькі здавальняючыя — 7. 19 чалавек (9 працэнтаў) атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Вынікі, вядома, маглі б быць лепшымі, калі б факультэты і кафедры аказвалі падрыхтоўчаму аддзяленню больш канкрэтнай дапамогі, калі б дэканы і загадчыкі адпаведных кафедр часцей бывалі на занятках, бліжэй знаёміліся са слухачамі, кантралявалі якасць выкладання, заслухоўвалі выкладчыкаў на пасяджэннях кафедр і саветах факультэтаў.

Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць студэнтам-выпускнікам падрыхтоўчага аддзялення. Яны павінны быць на асобым уліку, ім трэба аказваць паўсядзённую дапамогу і ўвагу. А робіцца ў гэтым напрамку вельмі мала.

Падрыхтоўчае аддзяленне перадало факультэтам за тры гады 279 сваіх выпускнікоў, а засталіся ў ліку студэнтаў 224, 55 чалавек былі адлічаны па розных прычынах і галоўным чынам з-за непаспяховасці. Асабліва вялікі адсеў на фізфаку—25, хімфаку—14. Гэтыя факультэты страцілі амаль чвэрць паступіўшых да іх з падрыхтоўчага аддзялення.

Вынікі зімовай сесіі былых слухачоў падрыхтоўчага аддзялення на факультэтах таксама жадаюць быць лепшымі: з 222 экзаменаваных толькі 4 здалі экзамены на выдатна, 42—на добра і выдатна, 20—толькі на здавальняюча і 64 студэнты (больш 25 працэнтаў) атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Такое становішча нельга лічыць нармальным.

Значная ўвага на вучоным савеце была ўдзелена пытанням навукова-даследчай работы студэнтаў. Выхаванне ў моладзі арганічнага імкнення весці творчы пошук — характэрная асаблівасць сучаснага стылю падрыхтоўкі спецыялістаў. Прайшоў той час, калі да навуковых даследаванняў прыцягвалася невялікая частка найбольш здольных студэнтаў. Задача цяпер заключаецца ў тым, каб кожны студэнт за час вучобы атрымаў навыкі самастойнай, блізкай да даследчай работы, засвоіў яе метады.

Плануецца, пачынаючы з гэтага года, адвесці ў вучэбных планах за кошт дысцыплін спецыялізацыі 150—200 гадзін для навукова-даследчай работы студэнтаў у VII—IX семестрах. Гэта задача пад сілу універсітэцкім кафедрам, якія маюць высокакваліфікаваны выкладчыцкі састаў, добра пастаўленую навукова-даследчую работу і сучасную лабараторную базу.

З 1973 года па ўсіх універсітэцкіх спецыяльнасцях уводзяцца новыя вучэбныя планы і праграмы, у якіх адлюстраваны змены ў тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўцы студэнтаў. Гэтымі планамі прадугледжана лагічная паслядоўнасць у вывучэнні прадметаў у іх узаемасувязі. З атрыманнем вучэбных планаў і праграм неабходна будзе на кафедрах арганізаваць дэталёвае вывучэнне з тым,

*(Заканчэнне на 2-й стар.).*

Камсамольскае жыццё

# СХОД РОБІЦЬ АНАЛІЗ

Камсамольскі сход трэцякурснікаў філалагічнага факультэта абмеркаваў стан ідэйна - выхаваўчай работы студэнтаў. Аб тым, што зроблена, расказала камсорг Тамара Сагановіч. Яна падкрэсліла, што грамадска-палітычная атэстацыя будзе экзаменам для кожнага студэнта. Не за гарамі той дзень, калі, атрымаўшы дыплом, малады спецыяліст павінен будзе перадаць увесь свой вопыт, усе свае веды падрастаючаму пакаленню. І толькі ў тым выпадку ён выканае свой абавязак перад грамадствам, калі ўжо ў студэнцкія гады зразумее ўсю адказнасць, якая кладзецца на яго.

Член акадэмічнага сектара Таня Вярбіцкая адзначыла, што наведванне лекцый на курсе пагоршылася. А гэта менавіта і ёсць адна з прычын дрэнных вынікаў вучобы ў некаторых студэнтаў.

Аб вучэбнай і ідэйна-выхаваўчай рабоце ў чацвёртай групе расказала Зоя Стукан. Студэнты гэтай групы ўзялі шэфства над адной з вясковых школ.

Камсамольцы другой групы падтрымліваюць сувязі са сваімі сябрамі з Ленінграда.

Яшчэ на першым курсе ў трэцяй групе быў арганізаван клуб цікавых сустрэч. Не раз студэнты сустракаліся з вядомымі паэтамі, пісьменнікамі, артыстамі, грамадскімі дзеячамі нашай рэспублікі. Гэта, вядома, пашырыла кругагляд кожнага камсамольца, узбагаціла яго веды.

**Размова ішла і пра навуковую працу. Ёсць тут поспехі ў Любы Тарасюк, Тоні Лойкі, Валодзі Лайкова і многіх іншых. На рэспубліканскі агляд было прадстаўлена восем навуковых работ. З іх шэсць атрымалі першую катэгорыю і дзве—другую.**

**Камсамольскі сход быў карысным і неабходным стымулам у павышэнні ідэйна-выхаваўчай і вучэбнай работы на курсе.**

І. РОЎДА.

# ЛЕНІНСКІ ЗАЛІК ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У адпаведнасці з рашэннем VIII пленума ЦК ВЛКСМ бюро камітэта камсамола ўніверсітэта прыняло пастанову: з мэтай далейшага развіцця працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці моладзі правесці Ленінскі залік «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё!»

На ўсіх факультэтах прыняты асабістыя сацыялістычныя абавязацельствы «Вучыцца камунізму».

Ленінскі залік — гэта справаздача кожнага камсамольца, кожнай пярвічнай камсамольскай арганізацыі аб вернасці ленінскім ідэям, аб асабістым укладзе ў работу камсамольскай арганізацыі. Таму трэба сканцэнтраваць свае намаганні ў галіне вучэбна-выхаваўчай, палітыка-выхаваўчай і навуковай работы.

Ленінскі залік закончыцца падвядзеннем вынікаў Усесаюзнага фестывалю савецкай моладзі, трэцяга, рашаючага года пяцігодкі да 50-годдзя прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.

ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА.



*Выдатную вучобу студэнткі ФПМ (злева направа) Юліана Хрыстава (Балгарыя), Адэліна Наркевіч, Людміла Тонкая і Алена Андруховіч плённа спалучаюць з актыўнай грамадскай работай. Юля — удзельніца мастацкай самадзейнасці, Люда — камсорг групы, Адэліна — член акадэмічнага сектара групы, Лена — рэдактар факультэцкай насценгазеты «Алгарытм».*

*Фота Н. НЕЧЫПАРЭНКІ.*

# ВУЧОБЕ—НАВУКОВУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

каб да 1 верасня гэтага года пачаць навучальны працэс на першых курсах па новых планах і праграмах.

Далейшае ўдасканаленне ўніверсітэцкай адукацыі непарыўна звязана з паляпшэннем вытворчага навучання. Яно садзейнічае замацаванню студэнтамі тэарэтычных і прафесійных ведаў, прымяненню іх у рашэнні прыкладных задач, развівае арганізатарскія здольнасці будучых спецыялістаў. Нездавальняюча арганізаваную практыку трэба разглядаць як невыкананне вучэбнага плана. Спецыяльным кафедрам належыць планаваць вывучэнне часткі вучэбнага матэрыялу ў перыяд практыкі. Заняткі па гэтых раздзелах курсаў павінны праводзіцца вядучымі канструктарамі, тэхнолагамі, эканамістамі і іншымі высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Кафедрам неабходна дабівацца таго, каб студэнты ў перыяд практыкі непасрэдна на вытворчасці выконвалі самастойныя работы ў выглядзе рэальных праектаў, навуковых даследаванняў, удзельнічалі ў правядзенні эксперыментальных работ і ўкараненні іх вынікаў.

Кафедры грамадскіх навук універсітэта абавязаны забяспечыць правядзенне на прадпрыемствах і ва ўстановах сумесна з партыйнымі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў.

У ліку важнейшых на вучоным савеце было і пытанне аб дыпломных работах студэнтаў-выпускнікоў. Дыпломная работа — гэта значны этап навучання, які сістэматызуе, замацоўвае і пашырае тэарэтычныя веды студэнта, паглыбляе вывучэнне ім адной з галін ведаў, авалоданне навыкамі самастойнага рашэння навукова-даследчых задач.

Дэканы і загадчыкі кафедр абавязаны ўзяць пад кантроль выкананне дыпломных работ студэнтамі, выдзеліць ім пэўнае рабочае месца. На працягу першага тыдня працы над дыпломнай яе кіраўнік разам са студэнтам павінен зацвердзіць дэталёва распрацаваны графік работы на ўвесь перыяд з указаннем чарговасці тэрмінаў выканання і працаёмкасці асобных этапаў работы. Не менш чым адзін раз у кожныя паўмесяца студэнт павінен даваць справаздачу свайму кіраўніку, які на аснове каляндарнага плана работы фіксуе ступень гатоўнасці дыпломнай.

Сярод іншых члены вучонага савета разгледзелі і пытанні аб тэхнічным забеспячэнні кафедр і лабараторый, аб паляпшэнні матэрыяльна-бытавых умоў студэнтаў, іх медыцынскім абслугоўванні, фізічнай загартоўцы.

# ПЕРШЫ КРОК ДА ПРАФЕСІІ

НАВУКОВА - ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА студэнтаў займае ўсё больш трывалыя пазіцыі ў навучальным працэсе, у працэсе падрыхтоўкі творчых спецыялістаў. Яна—першы крок будучага спецыяліста, а чым раней будзе зроблен гэты крок, тым больш упэўнена пойдзе даследчык па лесвіцы навукі, тым большых вяршынь ён дасягне, бо сама навуковая работа стымулюе дасканаласць ведаў. А убачыць, асэнсаваць якасць засвоенага і неабходнасць вывучэння новага можна толькі выпрабаваўшы атрыманыя веды ў дзеянні. Таму падключэнне студэнтаў на першых курсах да навукова-даследчай працы з'яўляецца задачай вялікай важнасці. Каб паспяхова яе вырашыць, савет СНТ фізічнага факультэта праводзіць шмат мерапрыемстваў.

Па ініцыятыве савета створан лекторый з мэтай дапамагчы кожнаму студэнту выразна азначыць напрамак будучай працы. Лекторый сістэматычна інфармуе малодшакурснікаў аб работах, якія вядуцца на кафедрах. Вялікую ўвагу СНТ удзяляе ўдасканаленню і папулярызацыі работы ў гуртках. Іх на факультэце тры, плюс лабараторыі СНДЛ, ЗВЧ. Ужо выканана на 70 тысяч рублёў работ і яшчэ на 1,5 тысячы—у студэнцкім вылічальным цэнтры. Усяго ў састаў СНТ уваходзяць каля 200 чалавек. Гэта ў асноўным студэнты IV—V курсаў.

У мінулым навучальным годзе на канферэнцыі было прадстаўлена 124 даклады. Але трэба сказаць, што кафедральныя арганізацыі зусім не садзейнічаюць рабоце СНТ. Там няма адказных за студэнцкую навуковую работу, і не дзіўна, што кафедры, напрыклад, тэарэтычнай фізікі, малекулярнай не вылучылі на рэспубліканскі агляд ні адной навуковай работы.

Цяпер пастаўлены наступныя задачы: дабіцца арганізацыі гурткоў пры ўсіх кафедрах, стварыць для кожнага гуртка дакладную праграму, заснаваную на актыўнай працы студэнтаў. Для папулярызацыі асноў навуковых ведаў, для выяўлення здольных студэнтаў на першых і другіх курсах у гэтым месяцы запланавана правесці алімпіяду па гісторыі КПСС, фізіцы, матэматыцы на лепшае веданне прадмета. Акрамя таго, ужо па традыцыі праводзяцца сустрэчы супрацоўнікаў вядучых кафедр са студэнтамі малодшых курсаў.

Наступнае звяно ў даследчай рабоце студэнтаў — падключэнне іх да гаспадарча-дагаворных работ. Вядзецца гэтая работа ў двух напрамках: па-першае, далучэнне да даследаванняў пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў факультэта па планавай тэматыцы і, па-другое, работа ў СНДЛ.

Асноўныя напрамкі студэнцкай навуковай дзейнасці на кафедрах уключаюць выкананне курсавых і дыпломных работ, пераклад навуковых артыкулаў і г. д. Як вынік—30 работ удзельнічала ў аглядзе 1972 года. Адной з іх прысуджана другая прэмія, 16 работ аднесены да першай катэгорыі, восем — да другой і дзве— да трэцяй.

А агляд-конкурс кафедр па пастаноўцы НДРС паказаў, што лепш за іншых вядзе гэтую работу кафедра ЗВЧ.

У гаспадарча-дагаворных работах занята 126 студэнтаў, у СНДЛ працуе 44 чалавекі. І гэтая форма НДРС патрабуе яшчэ пашырэння і ўдасканалення. Мэтазгодна для больш шырокага ахопу студэнтаў стварыць філіялы СНДЛ.

Далучэнне студэнтаў да навуковай працы — вялікая і складаная задача. Але яе рашэнне дапаможа даць нашай краіне больш вопытных спецыялістаў розных галін фізічнай навукі. І дзеля сур'ёзных поспехаў на шляху яе рашэння трэба аб'яднаць намаганні СНТ, партыйнай арганізацыі, камсамола і кафедр.

**Л. ШАБАН,**
**А. БЛАХІН,**
**студэнты.**

# ЭКЗАМЕН ПРЫМАЕ РАДЗІМА

На працягу некалькіх год фізічны факультэт утрымлівае вядучае месца па ваенна-патрыятычнай рабоце. У некаторай ступені гэта тлумачыцца спецыфікай самога факультэта: ён — самы тэхнічны, самы мужчынскі. Але асноўную ролю адыгрывае ўвага, якая ўдзяляецца гэтаму боку выхаваўчай работы партыйным бюро, камітэтам камсамола, камітэтам ДТСААФ. Прыклад гэтага — актыўны ўдзел студэнтаў у турысцкіх паходах а месцах баявой і працоўнай славы, сустрэчы з воінамі падшэфнай часці і ветэранамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, наведванні музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, экскурсіі ў крэпасць-герой Брэст, мемарыяльны комплекс «Хатынь», на Курган Славы, удзел у спаборніцтвах па ваенна-прыкладных відах спорту і многае іншае.

Возьмем, напрыклад, сустрэчы з воінамі падшэфнай часці. Традыцыя гэтая ўзнікла даўно і з гадамі яна мацнее. Толькі сёлета адбылося дзве сустрэчы. Спачатку гасцямі воінаў былі супрацоўнікі нашага факультэта. Яны прачыталі некалькі лекцый аб фізфаку, аб БДУ, аб сваіх паездках за мяжу. 24 лютага ў актавай зале адбылася новая сустрэча, прысвечаная 55-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Карысць гэтых сустрэч цяжка пераацаніць.

Неад'емная частка ваенна-патрыятычнай работы — удзел студэнтаў у спаборніцтвах па ваенна-тэхнічных відах спорту. Аднак хоць наш факультэт з году ў год займае першае месца, справы абстаяць не так добра, як здаецца. Чаму? Ды няма сапраўднага клопату аб развіцці гэтых відаў спорту. Студэнтаў-фізікаў, напрыклад, якія жадаюць займацца ў стралковым і парашутным гуртках, секцыі карцінга, радыёспартам, — не злічыць, але з-за недахопу сродкаў толькі нямногім з іх удаецца здзейсніць сваю мару. Абмяжуемся толькі двума прыкладамі. У пачатку навучальнага года студэнты прапанавалі стварыць секцыю карцінга. Камітэт ДТСААФ факультэта падтрымаў гэтую прапанову. У секцыю запісалася каля тысячы (!) жадаючых, але сродкаў не выдзелілі. Далей, фізічныя факультэты амаль усіх універсітэтаў маюць грамадскія радыёстанцыі. Некалі была і ў нас такая. Аднак хутка памяшканне ў нас адабралі (спачатку часова, а цяпер і назаўсёды). Таму і прыходзіцца рабятам праяўляць сваю творчасць у інтэрнаце, дзе няма адпаведных умоў, ды дзе і ўвогуле гэта забаронена. Па нашаму меркаванню, гэтыя абставіны ў нейкай ступені ўплываюць і на здачу норм ГПА. А яна, дарэчы, на фізфаку ідзе не бліскуча. Прапаганда мэт і задач новага комплексу вядзецца недастаткова шырока і не на належным узроўні. Праўда, цяпер становішча выпраўляецца: актыўна прайшла здача нарматываў ГПА па лыжнаму спорту.

Нягледзячы на недахопы, ваенна-патрыятычная работа на факультэце развіваецца і дае плён. І мы ўпэўнены, што экзамен па фізічнай і ваенна-тэхнічнай падрыхтоўцы, па здачы нарматываў комплексу ГПА камсамольцы нашага факультэта вытрымаюць з гонарам.

В. ВАРНАКОЎ,
В. ПІСКАРОЎ.

# ІДЗЕ РАЗМЕРКАВАННЕ

**Больш, чым каму, нясе вясна хваляванняў пяцікурснікам. Размеркаванне...**

**Для адных яно радаснае, іншыя ж застаюцца крыху засмучанымі.**

**Філолагі і географы былі размеркаваны па плану Міністэрства асветы БССР, у асноўным у Калінкавіцкі, Мазырскі, Слонімскі, Шчучынскі, Віцебскі, Талачынскі, Пухавіцкі і іншыя раёны рэспублікі.**

**Са 115 студэнтаў V курса геаграфічнага факультэта толькі некаторыя альбо засталіся на кафедрах свайго факультэта, альбо атрымалі права на самастойнае ўладкаванне на работу, а вось Валя Жывіца, напрыклад, накіравана на работу ў Беларускі філіял навукова-даследчага інстытута працы.**

**Сёння перад дзвярыма з надпісам «Камісія па размеркаванню», святочна апранутыя, хвалююцца біёлагі, заўтра іх зменяць хімікі.**

# БЫЦЬ ПАТРЭБНЫМ ЛЮДЗЯМ

Калі я іду з «Ленінкі» ля Акруговага Дома афіцэраў, заўсёды ўспамінаю 16 лютага 1973 года — дзень адкрыцця рэспубліканскага злёту студэнтаў Беларусі. Мне пашчасціла быць дэлегатам студэнцкага форума. Канешне, як пасля кожнай значнай падзеі, засталося шмат уражанняў. Злёт даў яшчэ раз адчуць сябе членам моцнай арміі — камсамола.

З трыбуны злёту студэнты расказвалі аб тым, як ідуць справы ў іх інстытутах. Свае заўвагі, прапановы, як палепшыць працэс навучання, яны адрасавалі адпаведным арганізацыям, міністэрствам, прадстаўнікі якіх былі ў зале.

Асаблівая ўвага ў дакладах была звернута на тое, што сучасны спецыяліст павінен не толькі добра разбірацца ў сваёй галіне ведаў, але і творча, з бачаннем перспектывы падыходзіць да справы.

Вучоба ва універсітэце дае магчымасць атрымаць вялікі аб'ём ведаў. Але тут ёсць небяспека: можна разгубіцца ў лавіне інфармацыі. Асабліва цяжка знайсці арыенцір першакурсніку.

Я пазнаёмілася з Янінай Ляльковай, студэнткай біёлага-глебавага факультэта Гомельскага універсітэта. Яна расказвала, што прыйшлося вучыцца пасля двух год работы, і займацца ёй было цяжэй, чым другім. Старшакурснікі арганізавалі кансультацыі, гутаркі з выдатнікамі аб правільным размеркаванні свайго часу. Гэта дапамагло ёй дагнаць сваіх таварышаў. Цяпер яна на V курсе, вучыцца на выдатна, выбрана дэпутатам Гомельскага гарсавета.

Ад правільнага размеркавання свайго часу, ад унутранай дысцыпліны залежыць многае: вучоба, набыццё трывалых ведаў, магчымасць плённа працаваць.

Воблік студэнта у кожнай навучальнай установе вызначае глыбіня ведаў, якія можна атрымаць, перш за ўсё, творча падыходзячы да справы.

Мне запомніліся словы з выступлення М. А. Барысевіча, прэзідэнта Акадэміі навук БССР: «Важна творча падыходзіць да работы»... А што такое творчасць? Яна ж прысутнічае ўсюды. Мы гаворым аб творчасці ў мастацтве, у навуцы, у літаратуры, у працы рабочага на заводзе. Што ж дазваляе прымяняць гэты тэрмін да такіх розных галін дзейнасці чалавека? Па-мойму, здольнасць не спыняцца на дасягнутым, імкненне да пошуку. Акрамя таго, трэба вельмі любіць сваю справу, а знайсці яе бывае не проста. Ты прыходзіш ва універсітэт з марамі, жаданнем зрабіць штосьці значнае. Па меры вучобы галіна ведаў пашыраецца, і ўсё цяжэй вызначыць, што ж цябе больш за ўсё прыцягвае, дзе можна прымяніць свае веды з найбольшай аддачай.

«Студэнцкія гады — гэта стартавая пляцоўка ў вялікае працоўнае жыццё», — гэтыя словы не раз паўтаралі на злёце.

Цікавая заканамернасць: чым больш вучышся, тым больш разумееш неабходнасць у грунтоўных ведах. Добра гэта было б зразумець раней. Мозг чалавека патрабуе сістэмы ва ўспрыманні інфармацыі. А сістэму так адразу не створыш. Патрэбны гады. Вучоба — гэта таксама майстэрства, таксама творчасць.

У навуковым таварыстве, напрыклад, са студэнта куецца сапраўдны даследчык у цікавячай яго галіне, выпрацоўваецца уменне самастойна аналізаваць, шукаць рашэнні, рабіць вывады.

Цікавая выстаўка тэхнічнай і мастацкай творчасці студэнтаў рэспублікі была арганізавана на злёце. На ёй былі прадстаўлены розныя прыборы, вырабы са шкла, керамікі. Многія прыборы ўжо выкарыстоўваюцца ў народнай гаспадарцы, ва ўстановах. Адзін прыбор, сканструяваны членамі СНТ Мінскага мед. інстытута, прывезлі на выстаўку прама з паліклінікі. Выкарыстоўваецца ён урачамі для прагназіравання зыходаў пры інфаркце міякарда. Ён прымушае звярнуць увагу на тых хворых, якія пры знешнім добрым стане здароўя патрабуюць інтэнсіўнага лячэння.

Пошук, творчасць — гэта нялёгкі, нават пакутлівы працэс, але адна з найлепшых узнагарод — калі, нарэшце, прыходзіць поспех, калі ствараеш нешта патрэбнае.

Адносіны чалавека да сваёй справы — гэта адно з праяўленняў асабістага «я». Калі гэтыя адносіны асэнсаваны, калі чалавек зацікаўлен глыбока ў іх, тады і вынікі бываюць добрыя. На мяне зрабіла вялікае ўражанне выступленне Героя Сацыялістычнай Працы І. І. Плаўскага. Ён старшыня калгаса. Яму ўжо за 30 год, а ён студэнт-завочнік Віцебскага ветэрынарнага інстытута. І, вядома ж, такі чалавек будзе імкнуцца выкарыстаць веды, укараняць у гаспадарку ўсё перадавое, заўсёды будзе шукаць новыя шляхі, метады паляпшэння сваёй работы.

Можа, якраз сэнс жыцця — быць патрэбным людзям настолькі, каб яны не маглі абысціся без цябе, тваіх ведаў, тваёй дапамогі.

**Л. ЦІТОВА,**
**студэнтка.**

# НАШЫ ГОСЦІ

На нашым курсе вось ужо другі семестр працуе універсітэт культуры. Мэта яго — садзейнічаць павышэнню культурнага ўзроўню студэнтаў. Універсітэт праводзіць сустрэчы з цікавымі людзьмі, з дзеячамі мастацтва і літаратуры. Перад студэнтамі выступалі навучэнцы музычнай школы, кінаакцёры, ветэраны вайны. Нядаўна прайшла цікавая сустрэча з пісьменнікам А. Е. Міронавым.

Напэўна, не знойдзецца студэнта, які б не прачытаў раманы «Толькі мора вакол», «Караблі ідуць у акіян», марскія апавяданні А. Е. Міронава. Гэтыя творы поўныя любві да мора, яго працаўнікоў. Яны выклікаюць пачуццё глыбокай павагі да марской прафесіі. Сам аўтар 17 гадоў служыў на флоце. Ён удзельнік эпапеі чэлюскінцаў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, далёкіх марскіх рэйдаў. Жыццё вызначыла тэматыку яго творчасці. Але час ставіць перад пісьменнікам новыя праблемы, падказвае новых герояў. Асноўная тэма работ А. Е. Міронава цяпер—жыццё сучаснай моладзі. І ён вывучае яго на пагранічных заставах, у студэнцкіх аўдыторыях, у працоўных калектывах — там, дзе праяўляе свае здольнасці, свой характар моладзь. Такога чалавека вельмі цікава паслухаць.

**А. АПАНАСЁНАК,**
**студэнтка.**



Ва універсітэцкай аранжэрэі рыхтуюцца да вясны. Фота Д. Чаховіча.

**Народны кантроль**

# ДОБРЫ ПАЧАТАК

Адбыліся чарговыя заняткі ва універсітэцкай «Школе народных кантралёраў», у якой займаюцца члены груп народнага кантролю і камсамольскія «пражэктарысты». Ад папярэдніх заняткаў яны адрозніваліся тым, што на іх прысутнічалі рэктар універсітэта прафесар У. М. Сікорскі і сакратар парткома дацэнт Т. Я. Дударава.

Прафесар У. М. Сікорскі выступіў з дакладам «Задачы народных кантралёраў і «пражэктарыстаў» універсітэта ў выкананні рашэнняў партыі аб далейшым развіцці вышэйшай школы». Ён падрабязна расказаў аб тых канкрэтных задачах, якія стаяць перад калектывам універсітэта ў цяперашні час і ў рашэнні якіх павінны прымаць самы актыўны ўдзел народныя кантралёры і «пражэктарысты», з тым, каб садзейнічаць далейшаму ўдасканаленню вучэбнага працэсу, навукова-даследчай работы, умацаванню дысцыпліны і паляпшэнню культурна-бытавога абслугоўвання студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Затым У. М. Сікорскі адказаў на пытанні.

Пакладзен добры пачатак. Будзем спадзявацца, што ў «Школе народных кантралёраў» выступяць прарэктары па вучэбнай, навуковай і адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце, галоўны бухгалтар універсітэта. Такія сустрэчы карысныя як для слухачоў, так і для выступаючых, таму што даюць магчымасць абмяняцца думкамі, падвесці вынік зробленага, вызначыць новыя задачы і шляхі іх рашэння.

**Я. ТАГУНОЎ,**
**старшыня універсітэцкай групы народнага кантролю.**

# РОЗДУМ ЛЯ ПАРАДНАГА ПАД'ЕЗДА

З чаго пачынаецца універсітэт? Цяпер мы з перакананнем можам сказаць— з вешалкі. Проста прыемна стала зайсці ў гардэроб, хутка апрануцца або распрануцца. Пасля таго, як там сталі дзяжурыць студэнты, зніклі чэргі. «КП» факультэта прыкладной матэматыкі даўно збіраўся прапанаваць гэтую меру, але так атрымалася, што ініцыятыва зыходзіла ад адміністрацыі галоўнага корпуса. Дзякуй ёй ад усіх студэнтаў!

З рашэннем «гардэробнай» праблемы яшчэ лепшы, прыгажэйшы стаў наш корпус, але быць яму ўзорным перашкаджаюць некаторыя недаробкі. Прайшло ўжо нямала часу з той пары, як было ўведзена дзяжурства студэнтаў на кожным паверсе. Але што яно дае, акрамя прыемнай магчымасці дзяжурнаму пачытаць мастацкую літаратуру? На трэцім, чацвёртым паверхах можна стаяць побач з дзяжурным у паліто і курыць, але не пачуць ніводнай заўвагі. Трэба або дабіцца, таго, каб дзяжурныя сапраўды дзяжурылі, або адмовіцца ад дзяжурстваў зусім. За прыкладам не прыйдзецца далёка хадзіць. На фізфаку строгія, няўмольныя хлопцы з павязкамі не дапускаюць ні малейшых адхіленняў ад устаноўленых ва універсітэце правіл паводзін.

Дарэчы, тыя ж студэнты, якія захочуць выкурыць сваю сігарэту, не выпрабоўваючы цярпення дзяжурных, сустракаюцца са значнымі цяжкасцямі. Канешне, лепш не курыць зусім, але той, хто прывык, дарэмна будзе бегаць па паверхах у пошуках адведзеных для курэння месцаў. Іх можна пералічыць па пальцах, калі нават прыняць усур'ёз таблічку «Месца для курэння», вывешаную на... жаночым туалеце трэцяга паверха.

Вельмі мала ў нашым корпусе і урн. Трэба адзначыць, што мы увогуле адчуваем недахоп элементарнага абсталявання. У туалетах вывернуты кранікі для піцця, зняты люстры. На шостым паверсе ў многіх аўдыторыях паламаны сядзенні. Канешне ж, ніхто, акрамя асобных несвядомых студэнтаў, спецыяльна не б'е люстры і не ламае крэслы. Чаму ж тады ад учынку, зробленага якімсьці хуліганам год назад (па крайняй меры небяспечна і цяпер сесці на сядзенні ў 606-й аўдыторыі), павінны цярпець непрыемнасці астатнія студэнты?

І яшчэ, калі размова зайшла аб дзяжурных, хочацца спыніцца на дзяжурстве ў вестыбюлі галоўнага корпуса пасля 19 гадзін. Некалькі дзён назад я стаяў там, атрымаўшы строгую інструкцыю: не прапускаць п'яных, а таксама правяраць дакументы і прымушаць усіх, хто ўваходзіць, без выключэння, здымаць паліто. Не ведаю, магчыма, я быў дрэнным дзяжурным, але п'яных мне не папалася, а пажылых мужчын, якія растлумачвалі, што яны распрануцца ў сябе ў кабінеце або ў лабараторыі, накіроўваць у гардэроб я саромеўся. Прасядзеўшы пяць гадзін, прызнаюся шчыра, я не прынёс ніякай карысці грамадству. Але ў душу закралася падазрэнне — ці не прападуць упустую ўсе дарагія студэнцкія гадзіны, праведзеныя на дзяжурстве ў вестыбюлі? Няўжо вахцёр горш справіцца з п'яным, чым маладзенькая дзяўчына-дзяжурная? А калі ўвесь дзень прапускаюць у корпус у верхнім адзенні ўсіх жадаючых, чаму гэтага нельга рабіць вечарам? Навошта тады гэтыя дзяжурствы? Ці не лепш іх адмяніць і ўмацаваць за кошт гэтага дзяжурства на этажах?

Хочацца, вельмі хочацца, каб наш корпус стаў яшчэ лепшым. Спадзяемся, што адміністрацыя прыслухаецца да нашых заўваг.

**Л. ГАРАДЗЕЦКІ,**
**начальнік штаба «КП» ФПМ.**

# ДАПАМАГЛІ КАНТРАЛЁРЫ

**Група народнага кантролю хімічнага факультэта актыўна дапамагае партыйнаму бюро і дэканату ў вырашэнні разнастайных задач. Так, кантралёры праверылі падрыхтаванасць вучэбнага корпуса да зімы, работу шклодуўнай майстэрні, сталовай, выкананне плана павышэння навуковай кваліфікацыі выкладчыкаў і выкананне імі вучэбнай нагрузкі, стан вучэбных аўдыторый і інтэрната, умовы захавання хімічных рэактываў у складскіх памяшканнях і інш.**

**У ходзе праверак выявілася, напрыклад, што значная частка абсталявання на кафедрах і ў лабараторыях на працягу навучальнага года загружана нераўнамерна, некаторыя каштоўныя прыборы, установкі доўгі час не ўводзяцца ў дзеянне. Кантралёры звярнулі ўвагу на тое, што на факультэце няма спецыялізаваных, цэнтралізаваных лабараторый для вызначэння стандартных характарыстык рэчываў і матэрыялаў. ГНК прапанавала разгледзець пытанне аб замацаванні апаратараў за унікальнымі ўстаноўкамі і абсталяваннем, аб арганізацыі цэнтралізаваных і спецыялізаваных лабараторый і шэраг іншых.**

**Па многіх рэкамендацыях ГНК прыняты меры, па іншых яшчэ вядзецца работа.**

**М. КНІГА,**
**старшыня ГНК хімфака.**

## ЧАКАЕМ ВАШЫХ ВОДГУКАЎ

*У пачатку красавіка на пасяджэнні групы народнага кантролю будуць абмеркаваны матэрыялы па праверцы выканання пастановы бюро універсітэцкай групы народнага кантролю ад 22 снежня 1972 года «Аб стане работы сталовых і буфетаў у сістэме Белдзяржуніверсітэта».*

*Просьба да ўсіх студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў прысылаць свае водгукі і пажаданні па паляпшэнню работы універсітэцкіх сталовых і буфетаў у групу народнага кантролю БДУ або ў рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт».*

*Л. БЫЛІНА,*
*намеснік старшыні групы народнага кантролю, кіраўнік сектара быту.*

# РЫХТУЙЦЕСЯ ДА АГЛЯДУ!

Па рашэнню рэктарата, парткома, мясцкома, камітэта камсамола, прафкома і праўлення клуба з 16 сакавіка ва універсітэце праводзіцца агляд мастацкай самадзейнасці факультэтаў. Мэта яго — далейшае развіццё студэнцкай творчасці, прапаганда мастацкімі сродкамі перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі, гістарычных заваёў савецкага народа пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі.



Створан арганізацыйны камітэт у складзе: С. А. Лысенкі (старшыня), А. Г. Слуцкі, М. М. Дразда, А. А. Фядотава, О. С. Мірэйчыка.

У журы агляду ўваходзяць кіраўнікі народных калектываў мастацкай самадзейнасці, а таксама прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

Журы вызначае тры першыя месцы па лепшай суме балаў.

Прадстаўленыя на агляд нумары мастацкай самадзейнасці ацэньваюцца па 10-бальнай сістэме. Журы мае права зняць ад аднаго да пяці балаў за недастаткова высокі ідэйны і мастацкі ўзровень адабраных да агляду канцэртных нумароў.

Пры падвядзенні вынікаў журы будзе ўлічваць тэматыку твораў і выканаўчае майстэрства, масавасць і ўдзел ва універсітэцкай мастацкай самадзейнасці.

Сярод галоўных паказчыкаў: сума балаў, якую атрымаў факультэт за лепшыя 15 нумароў праграмы, удзел у агульнауніверсітэцкіх калектывах мастацкай самадзейнасці, шэфская работа на прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах і школах, колькасць вечароў адпачынку.

Ацэньваючы мастацкі ўзровень выканання, журы звяртае ўвагу і на сцэнічную культуру ўдзельнікаў і мае права заахвоціць факультэт (ад 5 да 10 балаў) за добрае сцэнічнае рашэнне канцэртнай праграмы.

Рашэнне журы аб'яўляецца на заключным канцэрце 28 красавіка 1973 года.

**МЕСЦА І ЧАС**

Агляд праводзіцца ў актавай зале ў наступныя тэрміны:

**16 красавіка 19-00—ФПМ,**
**20-30—матфак**
**17 красавіка 19-00—хімфак**
**20-30—фізфак**
**18 красавіка 19-00—журфак**
**20-30—філфак**
**20 красавіка 19-00—юрфак**
**20-30—біяфак.**

**УМОВЫ**

У аглядзе могуць прымаць удзел студэнты стацыянара, вячэрнікі і завочнікі, аспіранты і выкладчыкі.

У дзень агляду факультэту даецца права правесці рэпэтыцыю ў актавай зале працягласцю не больш дзвюх гадзін. Паўтарагадзінная праграма канцэрта павінна ахапіць розныя жанры і формы самадзейнага мастацтва; уключаць выступленні вакальных ансамбляў, танцавальных груп, індывідуальных выканаўцаў, народных і эстрадных аркестраў, выканаўцаў-інструменталістаў (фартэпіяна, скрыпка, народныя інструменты), мастацкае чытанне, пантаміму, тэатральныя пастаноўкі і г. д. Кожны саліст можа выканаць не больш двух твораў.

Праграмы канцэртаў неабходна прадставіць у праўленне клуба не пазней 14 красавіка ў шасці экземплярах з указаннем імён і прозвішчаў аўтараў і выканаўцаў кожнага нумара.

**УЗНАГАРОДЖАННЕ**

Калектыў мастацкай самадзейнасці, які зойме І месца, узнагароджваецца Пераходным чырвоным сцягам, Ганаровай граматай і грашовай прэміяй. Ганаровыя граматы і грашовыя прэміі атрымаюць калектывы, заваяваўшыя ІІ і ІІІ месцы.

Устаноўлены спецыяльныя прызы: за масавасць, за лепшае выкананне патрыятычнай песні, лепшаму дэкламатару.

**АРГКАМІТЭТ.**

РЭПЛІКА ЧЫТАЧА

# ЯК ТУТ БЫЦЬ?

— З партфелямі нельга, — пачуў я голас бібліятэкара, адчыніўшы дзверы чытальнай залы № 3.

Як быць? Заўтра ж практычныя заняткі па палітэканоміі... Яшчэ раз паспрабаваць, ці што?

— Нясіце ў гардэроб,— сказала мне тая ж жанчына.

Бягу на першы паверх і...

— Малады чалавек, зразумейце. Нам і так шмат работы, а тут яшчэ вы са сваім партфелем. Вось каб нішы для іх зрабілі... Усё ж давайце, пастаўлю на падлогу. Калі будзеце апранацца, скажыце аб партфелі.

Уф! Нарэшце-такі я зайшоў у чытальную залу. Цішыня. Студэнты схіліліся над кнігамі, канспектамі. Даю білет чытача.

— Ваша месца 25-е. Шукайце!

— А я прывык заўсёды сядзець каля акна.., — хацеў было растлумачыць, але бібліятэкар адрэзала:

— Людзі займаюцца. Не перашкаджайце!

Знайшоў я «сваё» месца. Ніколі не сядзеў тут. Ніяк не мог сканцэнтравацца. Недарма ж гавораць: працаваць лепш на прывычным месцы, нават сусед новы побач — і гэта ўжо ўплывае на вынік работы. Прасядзеў каля дзвюх гадзін. Да практычных, праўда, падрыхтаваўся. Партфель мне аддалі не адразу. Усё пыталі, ці сапраўды ён мой. Можа падманваю?

У другі раз партфель у гардэробе не ўзялі. Бібліятэкар параіла звярнуцца да загадчыка. Дзе ж яго шукаць? Ды і часу маю небагата, каб займацца такой справай. Паехаў у «Ленінку».

І вось, нарэшце, учора зноў пайшоў у чытальную залу. Адразу ж бачу наваўвядзенне: перад уваходам на паліцах гарамі ляжаць папкі, сумкі, партфелі. Пакінуў і я свой. Сяджу, чытаю, пазіраю на суседзяў. Яны раз-пораз выходзяць за дзверы. Зразумела: трэба ж паглядзець, ці на месцы пакінутыя без догляду партфелі. Свой ледзьве знайшоў. Яго нехта скінуў на падлогу.

Больш мне не хочацца ісці ў студэнцкую чытальную залу. **У. СКУЛЬБЕДАЎ.**

БЫТ СТУДЭНЦКІ

# ДОБРА ЖЫВЕЦЦА?

Яшчэ з вуліцы студэнт факультэта журналістыкі Віктар Кубека ўбачыў, што ў ленінскім пакоі гарыць святло. Як? Без яго дазволу адкрылі? І нават каляровы тэлевізар працуе? Ён забег у пакой і хацеў было абрушыць моц свайго голасу на вінаватых. На шчасце, імі аказаліся добра знаёмыя хлопцы, якія глядзелі матч паміж баскетбалістамі маскоўскага «Дынама» і камандай РТІ (Мінск).

— Я зараз прыйду, — сказаў Віктар. — Глядзіце, каб усё было ў поўным парадку. — І пайшоў.

Многія з хлопцаў чыталі газеты і часопісы, што ляжалі тут жа, размаўлялі, спрачаліся...

Я падумаў: добрая справа зроблена. Можна ў ленінскім пакоі гутарку правесці, пагаварыць аб новай кнізе, правесці шахматна-шашачны турнір.

З пытаннем: «Чаго не хапае для добрага адпачынку ў інтэрнаце № 4?» я звярнуўся да многіх студэнтаў і вось што пачуў:

— Хацелася б, каб ленінскі пакой адкрываўся часцей, а не толькі для прагляду кінафільма ці спартыўнай перадачы.

— Нядрэнна было б арганізаваць сустрэчу студэнтаў розных факультэтаў (у нашым інтэрнаце жывуць юрысты, журналісты, філолагі, біёлагі) з расказам аб вучобе, будучай прафесіі. Толькі дзе? Ленінскі ж пакой закрыт амаль увесь час.

— Цішыні пасля дванаццаці гадзін ночы.

— Больш дзейснай работы савета інтэрната па арганізацыі масавых мерапрыемстваў.

На гэтым я і закончу. Мяркуйце самі, добра ў нас?

**В. УЛАДЗІМІРАЎ.**

# ВАС ЗАПРАШАЮЦЬ

Аб яе нараджэнні паведамілі аднойчы ўсе дошкі аб'яў. Яркія запрашэнні з'явіліся ў кожным корпусе. Яны прапаноўвалі наведаць залу комплексных абедаў, што адкрылася ў хімкорпусе.

Прайшло ўжо больш тыдня, і цяпер, напэўна, можна больш-менш грунтоўна гаварыць аб станоўчых і адмоўных баках гэтага новаўвядзення. За гэты кароткі час зала займела «пастаянных кліентаў», у наведвальнікаў склалася пэўнае меркаванне аб ёй. А ў работнікаў сталовай хімкорпуса праблемы і нарадзіліся прапановы па паляпшэнню абслугоўвання студэнтаў у новай зале.

Калі пастаяць у чарзе ля стойкі буфета, то можна пачуць самыя розныя выказванні адносна адкрыцця залы.

— Ну, вядома, чым стаяць паўгадзіны ў чарзе ў сталовай, лепш тут...

— Лягчэй стала: не трэба меню чытаць і мучыцца, што выбраць. Тут што дадуць, тое і возьмеш...

— Але ж такі гарнір я і бясплатна есці не хачу...

Тым часам у другой чарзе, дарэчы, намнога даўжэйшай, — размова на тую ж тэму.

— Чаму не карыстаюся залай комплексных абедаў? Усё па старой прывычцы сюды іду...

— Я люблю выбар...

З гэтых выпадкова пачутых рэплік можна зрабіць пэўныя вывады: адкрыццё залы каго-ніякага вызваліла ад неабходнасці траціць час на чаргу ў сталовай, з другога боку — трэба падумаць, як лепш арганізаваць яе работу, каб наведвальнікі былі задаволены не толькі сэканомленым часам, але і смачным абедам.

Зала адкрыта з 12 да 15 гадзін. За гэтыя тры гадзіны яе наведваюць каля 120 чалавек. Калі ўлічыць, што тут, як і ўсюды, бываюць гадзіны «пік», а ў зале толькі 9 столікаў, то зразумела, што месц не хапае. У гэты ж час вырастае чарга і ў сталовай. Там таксама не хапае месц.

Загадчык вытворчасці Антаніна Карпаўна Карпенка дзеліцца сваімі думкамі, як знайсці выхад з гэтага становішча.

— Мы ўжо даўно просім дазволу ліквідаваць залу для выкладчыкаў. Яна амаль заўсёды пустая. Разабраць сцяну — ведаеце, колькі месц прыбавіцца. Узамен як можна было б арганізаваць стол для выкладчыкаў, як у галоўным корпусе...

У нейкай меры гэтым вырашыцца праблема недахопу месца і ў зале комплексных абедаў: нейкую частку з яе цяперашніх наведвальнікаў у гадзіны «пік» зможа абслугоўваць сталовая.

Яшчэ адна праблема — неабходнасць павелічэння штату сталовай. Патрэбны павары, пасудамыйка, дадатковае абсталяванне на кухню.

— Пліта ў нас малая. Раней спраўляліся, а з адкрыццём залы прыбавілася работы. Прадукты нам прывозяць каля адзінаццаці гадзін. Да дванаццаці мы павінны прыгатаваць абед і для сталовай і комплексны. На малой пліце гэта цяжка зрабіць, — гаворыць далей Антаніна Карпаўна. — Абяцалі нам прывезці большую, але пакуль без яе прыходзіцца ўпраўляцца...

А як быць з густам наведвальнікаў, як задаволіць тых, хто «любіць выбар»? Гэта яшчэ адна праблема. У зале адна раздача. Арганізаваць другую немагчыма з-за цеснаты. А калі на адной раздачы выдаваць два комплексы? Напэўна, гэта магчыма і дапаможа задаволіць густы большасці наведвальнікаў. Хоць меню штодзень абнаўляецца, але каб займець пастаянную прыхільнасць наведвальнікаў, варта, напэўна, замяніць правіла «што даюць — бяру» на «бяру, што хачу». Трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу і на якасць прыгатавання абедаў, тым больш, што ў кнізе скарг і прапаноў сталовай хімкорпуса не-не ды і з'явіцца гнеўны запіс у адрас павароў.

Увогуле ж стварэнне залы комплексных абедаў з цягам часу павінна праявіць сябе са станоўчага боку. Хоць ёсць цяпер такія, што аддаюць перавагу «выбару», а не комплексным абедам, але лік наведвальнікаў залы расце.

Ала Васільеўна Звярынская, работніца буфета, у якой можна купіць талон на абед, з задавальненнем параўноўвае лічбы: у першы дзень залу наведалі ўсяго 38 чалавек, а ўжо на наступны іх было 140.

Ёсць надзея, што лік прыхільнікаў залы будзе расці, кніга водгукаў і прапаноў змесціць не адну падзяку — але гэта ўжо ў значнай меры залежыць ад работнікаў сталовай.

**Т. СІВЕРЫНА.**



*ПОДЫХ ВЯСНЫ.* *Фота В. ЖУКА.*

# *СПАБОРНІЦТВЫ МАЙСТРОЎ ШТАНГІ*



Новая спартыўная зала БДУ — зала цяжкай атлетыкі — засведчыла ў сваіх сценах першыя рэкорды. Тут быў узнят сцяг першынства БДУ па цяжкай атлетыцы. Балельшчыкі атрымалі магчымасць назіраць за спаборніцтвамі мацнейшых цяжкаатлетаў універсітэта і за выступленнямі пачынаючых спартсменаў.

Зборная БДУ па цяжкай атлетыцы — адна з мацнейшых каманд у рэспубліцы, чэмпіён горада. Гэтыя спаборніцтвы ў нейкай меры з'явіліся падрыхтоўкай да новых яе перамог.

Нешматлікая, але на дзіва зацікаўленая аўдыторыя балельшчыкаў, падпарадкоўваючыся папярэджанням суддзяў, прыціхала ў чаканні, каб потым узарваць цішыню апладысментамі, калі на памост выходзілі мацнейшыя: В. Стронгін, М. Жыцянёў — неаднаразовыя чэмпіёны БДУ і Белсавета ДСТ «Буравеснік», В. Марчук, У. Каськоў, У. Фралоў — майстар спорту па класічнай барацьбе і цяжкай атлетыцы.

У першы дзень спаборніцтваў пераможцамі сталі П. Ерафееў (гістфак), У. Каськоў, (член спортклуба), А. Бык, В. Стронгін (фізфак). У наступны дзень дабіліся поспеху М. Жыцянёў (юрфак), М. Яноўскі, Ю. Лапацкі (гістфак), Г. Трапашка (фізфак).

Пераможцам уручаны граматы спартыўнага клуба універсітэта.

У камандным заліку на першым месцы юрыдычны факультэт, на другім — фізічны, на трэцім — гістарычны. Чацвёртае, пятае і шостае месцы адпаведна ў каманд геафака, журфака і ФПМ.

**Т. КАНСТАНЦІНАВА.**

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2.000 экз.
АТ 07134
Заказ 335.